ОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

105 (1072) | ЧАЦЬВЕР, 8-га мая 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 "
6 месяцаў . . . 1 р. 80 "
1 год . . . 3 р. 30 "
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ IX.

Кошт асобнага №—2 кап.

11-га МАЯ 5-ты ПЛЕНУМ ЦК ЛКСМБ

Усім членам і кандыдатам ЦК і цэнтральнай рэвізійнай камісіі ЛКСМБ

11 мая г. г. склікаецца 5-ты пленум ЦК ЛКСМБ з наступным парадкам дню:

1) Даклад бюро ЦК ЛКСМБ аб выкананьні дырэктыў пленуму ЦК КП(б)Б і ЦК УсеЛКСМ (Дакл. тав. Палякоў).

2) Даклад аб падрыхтоўцы кадраў і задачах ЛКСМБ (Дакл. т. т. старшыня Дзяржпляну Гольдбэрг і Шоламаў),

3) Аб вайскова-фізкультурнай рабоце (Дакл. т. т. Ільлічаў і Леў).

4) Аб перавыбарах бюро ячэек і комітэтаў ЛКСМБ (Дакл. тав. Рындзіч).

Сэкратар ЦК ЛКСМБ ПАЛЯКОЎ.

КОМУНІСТЫЧНЫ РЭВОЛЮЦЫЙНЫ РУХ НЯСЕ ПАГІБЕЛЬ СУСЬВЕТНАМУ КАПІТАЛІЗМУ

…СЬВЕТНЫ ЭКОНОМІЧНЫ КРЫЗІС, ЯКІ ЎСЁ БОЛЕЙ АБВАСТРАЕЦЦА, ПАГЛЫБЛЯЕ КЛЯСАВЫЯ СУПЯРЭЧНАСЬЦІ ПАМІЖ ПРАЦАЙ І КАПІТАЛАМ, ПАДЫМАЕ НОВЫЯ РЭВОЛЮЦЫЙНЫЯ ВЫСТУПЛЕНЬНІ ПРОЛЕТАРЫЯТУ І ПРЫГНЕЧАНЫХ НАРОДАЎ КАЛЁНІЙ ПАД ЛЁЗУНГАМІ КОМІНТЭРНУ

…йкі паўстанцкіх атрадаў з урадавымі войскамі

…АНХАЙ, 3-5. Паўстанцкія атра… ў раёне Сватоу бявупынна па…аюцца мясцовымі сялянамі. …ёне Кайын (Гуандунь) ідуць між паўстанцкімі атрадамі і …авымі войскамі. Увесь пагра… …ы раён між Фуцьзянам і Гуан…м ахоплен паўстаньнямі. Горад …ан абкружан паўстанцкімі атра… У раёне Лунчжоў (Гуансі) …ілася двейнасьць Чырвонай ар… (у гэтым раёне французскія …оеныя сілы ніарынулі ўзьнікшы …овы савецкі ўрад). Хубэйскія …ы паведамляюць, што значная …ка провінцыі Хубэй ахоплена …скімі хваляваньнямі. У пра… сакавіка і красавіка зарэгістравана звыш 100 гарадоў, вёсак, паветаў, стаўшых арэнай жорсткай барацьбы між сялянскімі паўстанцкімі атрадамі і ўрадавымі войскамі. У шмат якія паветы накіраваны з Ханькоў карныя экспэдыцыі. Газэты пішуць аб немагчымасьці падавіць сялянскія паўстаньні, бо ўсё працоўнае насельніцтва провінцыі спачувае паўстанцам. Шанхайская падпольная газэта „Шанхай Бао" паведамляе, што зараз у Кітаі маецца 13 чырвоных армій. Колькасны склад армій, па словах газэты, дасягае 60 тысяч байцоў пры 46 тысячах стральбаў, 650 кулямётах, 180 артылерыйскіх гарматах і некалькіх самалётах.

Асаднае становішча ў Юга-Славіі ня зьнята

ВЕНА, 6. Абвешчанае напярэдадні 1 мая асаднае становішча ў Юга-Славіі дагэтуль яшчэ ня зьнята. Працягва…а масавыя арышты рабочых. Паліцыя, між іншым, узмоцнена расшуквае лётнікаў, якія скінулі комуністычныя …чкі з аэрапляну ў шэрагу гарадоў Юга-Славіі.

Пашырэньне комуністычнай пропаганды

…ЕНДАН. 4.—Корэспондэнт кон…ртыўнага „Обсэрвот" паведам… „Пэшавар наводнен пропаган…ай літаратурай. Комуністыя і Ліга моладзі вядуць пропаганду ў вёсках, дзе выступаюць з чырвонымі сьцягамі значкамі, на якіх выбіты „серп і молат".

Новыя весткі аб вырабе антысавецкіх фальшывак

Нью-Ёрк, 5. Як паведамляюць з Вашынгтону, некаторыя газэтныя корэспондэнты мяркуюць, што ў вырабе антысавецкіх фальшывак удзельнічаў вядомы фабрыкант фальшывак Нагавіцкі. Корэспондэнт ТАСС з пэўных крыніц даведаўся, што адзін расейскі белагвардзеец (былы царскі афіцэр) яшчэ да апублікаваньня фальшывак Уоленам прапанаваў купіць іх двум кіруючы газэтным прэсам у Нью-Ёрку.

Генштабы згаварваюцца аб утварэньні

вайсковай прамысловасьці

Вена, 3. *Як паведамляюць румынскія газэты, выехаўшая ў Варшаву румынская ваенная місія, на чале з начальнікам генэральнага штабу Самсонавікі будзе абгаварваць з польскім генштабам пытаньні аб рэорганізацыі арміі, мобілізацыі прамысловасьці і ўтварэньні ваеннай прамысловасьці. Мяркуючы па намёках румынскіх газэт, да гэтых перагавораў прыцягнуты прадстаўнікі францускага генштабу.*

Шэрсьцянікі працягваюць забастоўку

ЛЁНДАН, 6 Хаця ўчора ўласьнікі многіх фабрык у раёне шэрсьцяной прамысловасьці заявілі аб тым, што іх прадпрыемствы аднаўляюць работу, толькі каля 100 рабочых ва ўсім раёне прыступілі да работы. У сувязі з гэтым амаль усе фабрыкі былі прымушаны зноў зачыніцца.

Крах банкаў у Амэрыцы

Нью-Ёрк. У першыя тры месяцы 1930 году пацярпелі крах 317 банкаў супроць 183 за першую чвэртку мінулага году. 87 проц. усіх пацярпеўшых крах банкаў падае на заходнія і паўднёвыя банкі. Агульны капітал буйнейшых банкаў у гэты пэрыод скараціўся на 10,8 проц., а сумы ўкладаў на 8 проц.

Паліцэйскі агонь па калёне комсамольцаў

БЭРЛІН, 6. У Вуппэртале паліцыя адкрыла агонь па калёне комсамольцаў. Трое ранена, з іх двое цяжка.

У Індыі высадзіліся новыя часткі ангельскага войска

ЛЁНДАН, 6. У канцы красавіка ў Бомбэі высадзіліся прыбыўшыя з Англіі новыя ваенныя часьці. Гэтыя часьці будуць сконцэнтраваны ў „ненадзейных раёнах".

Зволена каля 20.000 рабочых

Шанхай. З прычыны недахопу сыравіны спынілі работу 50 фабрык па апрацоўцы шоўку. Зволена 20.000 рабочых.

Паліцэйская ўлада ня мела магчымасьці справіцца з паўстанцамі

ЛЁНДАН, 6. Першамайскія дэмонстрацыі у Дырвіне (Паўночная Аўстралія) выліліся ў вельмі сур'ёзныя супроцьурадавыя выступленьні. Памяшканьне ўрадавага адміністратара захоплена беспрацоўнымі. На галоўнай плошчы гораду замест нацыянальнага сьцягу ўзьвіваецца чырвоны сьцяг. Паліцэйская ўлада, апынуўшаяся ў замяшаньні, ня мела магчымасьці справіцца з паўстаўшымі.

Судовая паліцыя і вайсковыя часткі адмаўляюцца падаўляць рух і пераходзяць на бок паўстанцаў

ТЭРМЭЗ, 5. Прыяжджаючыя з Індыі перадаюць аб надзвычайна напружаным становішчы ў Пешаварскім раёне. Па іх словах адзін з камандных над Пэшаварам партоў захоплен і ўтрымліваецца паўстанцамі. На вуліцы Пэшавару ідуць жорсткія баі. Судовая паліцыя і вайсковыя часткі адмаўляюцца падаўляць рух і пераходзяць на бок паўстанцаў. Зносіны паміж Кабулам і Пэшаварам прарваны. Паўстанцкім рухам у Пэшаварскім раёне кіруе аб'яднаны рэволюцыйны камітэт у складзе мусульман, індусаў і сыкхаў, якія парвалі са старым рэлігійным бязладзьдзем, што ня раз зрывала адзінства нацыянальна-рэволюцыйнага руху ў Індыі.

Арышт супрацоўніка савецкага гандлёвага

прадстаўніцтва ў Мэксыцы

НЬЮ-ЁРК, 6. У Мэксыцы арыштаваны супрацоўнік савецкага гандлёвага прадстаўніцтва тав. Фрыдман, які застаўся ў Мэксыцы для ліквідацыі гандлёвых спраў. Таварыш Фрыдман высылаецца з Мэксыкі на будучым тыдні.

…зносная становішча кітайскага сялянства

…міданаўскія мілітарыстыя ўчыняюць нябачныя …вавыя расправы над малейшымі рэволюцыйнымі ўчынкамі

(Ліст кітайскага чырвонаармейца)

…падпольнай кітайскай газэце „…нхай Бао" зьявіўся наступны …чырвонаармейца аб становішчы …мажы Хубэя і Хэнані, які мы …без усялякіх зьмен.

„…Выхаваўчы пэрыод" гомінданаў…га ўраду мае ўжо трохгадовую …торыю і таму да рэчы будзе за…цць: якавы-ж вынікі гэтых трох …оў.

…Першае, што рэзка кідаецца ў …—гэта абвастрэньне клясавай …ацьбы. Гомінданаўскія мілітары… …давалі прыгнечанасьць сялян… ў Хубэі і Хэнані да немагчы… …памераў. У абодвых правінцыях …снуюць шматлікія падаткі. Існуе …датак на забой жывёлы, падатак …табак і віно, падатак на штуч…е ўгнаеньне, падатак на кватэру …печ у доме, падушны падатак, …ворны падатак, падатак за заха…ваньне чыстаты ў вёсцы, падатак …барацьбу з бандытызмам, пада… …на стральбы, на электрычнасьць, …атак пры жаніцьбе, пры сьмерці …на сям'і.

…Зямельны падатак з году ў год …павялічваецца. У шмат якіх паве…х Хэнані ўжо аплачаны сялянамі …даткі па 1936 год. Можна ска…ць, што ў „мірны час" падаткі …мушаюць сялянства ня імкнуцца …жыцьця, а шукаць сьмерці. У …падку вайны бесьперапынна кла…цца новыя цяжкасьці. Сялянскія …ьцы сілком зацягваюцца ў армію, рабуюць жывёлу ў сялян і на мясцовае насельніцтва падае абавязак утрымоўваць салдат. Аб вайсковых руйнаваньнях гаварыць ня прыходзіцца. Гэтыя ўмовы гоняць сялянскія масы ў бандыцкія атрады, бо ўсе надзеі на памяншэньне падаткаў вычарпаліся. Гомінданаўскія генэралы не дапускаюць ніякага вызваленьня ад падаткаў і для збору іх арганізуюць спэцыяльныя атрады, якія спаганяюць падаткі ўзброенай сілай.

Але ня ўсе сяляне ідуць у бандыты. Многія, ня гледзячы на небясьпеку, спыняюць плату падаткаў і паступова сярод сялянства нараджаецца рух, які прымае ў некаторых мясцох вельмі вострыя формы, у асаблівасьці тады, калі рух пераходзіць на вышэйшую ступень — да конфіскацыі абшарніцкай зямлі, арганізацыі сваіх сялянскіх узброеных атрадаў і ўлады. У такіх выпадках пачынаецца жорсткая барацьба, бо гомінданаўская ўлада ня хоча скласьці аружжа бяз бою і ўпарта змагаецца за сваё існаваньне. Іх політыка пры гэтым вельмі простая: яны ўтвараюць крывавую ачыстку вёскі. Калі вёска не пажадае арганізавацца ў асобую гомінданаўскую кампанію для лоўлі і выжыцьця комуністых, дык уся вёска зруйнуецца і зьнясецца з твару зямлі.

У тых мясцох, дзе разьвіваўся сялянскі рух на глебе неўплаты падатку, сялянскія хаты зруйнаваны на 50-60 проц. Там-жа, дзе арганізавалася рэволюцыйная ўлада, цярпела ня менш 90 проц. сялянскіх дамоў і гаспадарак. Акрамя таго, генэралы саджаюць многіх удзельнікаў руху ў турмы і забіваюць іх масамі. У адной вёсцы Хэнаньскага павету было растраляна адразу 200 сялян. Быў выпадак, калі сяляне аднае вёскі Шыокайскага павету (Хубэй), з прычыны высокай цаны рысу, самавольна захапілі рысавы склад буйнага мясцовага купца і разьмеркавалі рыс між сялянамі. Пасьля гэтага начальнік павету безадкладна накіраваў у вёску дзьве сотні салдат, даўшы ім дваццаць вёдраў газы. У працягу некалькіх гадзін пяць вёсак былі зруйнаваны, 150 сялянскіх дамоў згарэлі, больш трыццаці сялян забіта.

Але сялянства ўсё больш і больш разумеюць неабходнасьць узмацненьня сваёй узброенай сілы і арганізуюць часовыя і сталыя арміі.

Сяляне 8-мі паветаў на мяжы Хубэю і Хэнані маюць такую армію. Усё мужчынскае насельніцтва ад 18 да 40 год уваходзіць у яе. Армія і кожны армеец захоўваюць строгую дысцыпліну, праводзяць поўную роўнасьць паміж салдацкім і камандным складам, арганізуць клюбы, розныя асьветныя і спартыўныя гурткі і групы, дапамамагаюць сялянскім масам конфіскаваць зямлю, разьмеркаваць яе, узбройваюць і выхоўваюць сялян. Сяляне сустракаюць армію бурнымі прывітаньнямі, называючы яе „сваёй", „нашай".

На першамайскай дэмонстрацыі ў Менску

На юбілейным вечары „Чырвонай Зьме

На перадавых позыцыях клясавай барацьбы

Упарта і энэргічна ажыцьцяўляючы генэральную лінію партыі, выхоўваючы ў яе духу шырокія масы комсамольцаў і беспартыйнай працоўнай моладзі газэта яшчэ больш энэргічна і ўпарта будзе працаваць над тым, каб усямерна дапагмачы комсамольскай організацыі ў перабудове сваёй работы адпаведнасьці з задачамі соцыялістычнага будаўніцтва. Газэта яшчэ больш упарта будзе выкрываць і біць па правым опортунізьме, які імкнецца сьцягнуць партыю з ленінскага шляху, не пасьлябляючы барацьбы з мнімай «левай» фразай.

Разгортваючы бальшавіцкую самакрытыку, будзем рашуча біць па рвачох, гультаёх, бюрократах і ў шкодніках соцыялістычнага будаўніцтва

З дакладу адказнага рэдактара газэты „Ч. З." т. Джэлюка

Барацьба з адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі

Сумесна з усім ЛКСМБ газэта правяла вялікую барацьбу з контррэволюцыйным троцкізмам, бязьлітасна выкрываючы ўсіх тых, хто імкнуўся пад усялякай „левай" фразай уцягнуць партыю ў балота контррэволюцыі. Газэта была сапраўдным організатарам шырокіх мас комсамольцаў і працоўнай моладзі, растлумачвала і выкрывала ўсю контррэволюцыйную сутнасьць троцкізму, загартоўваючы шэрагі комсамолу да непрымірымай барацьбы з усялякімі адхіленьнямі ад гэнер. лініі партыі.

Комсамольская організацыя Беларусі і яе газэта вялі і вядуць шалёную барацьбу з правай небясьпекай, шырока завастраюць увагу мас комсамольцаў і беспартыйнай моладзі на гэтых пытаньнях. Аднак, тыя політычныя прарывы, якія мелі месца ў мінулым кіраўніцтве ЦК ЛКСМБ, мелі месца і ў газэце. Зусім слаба мобілізаваліся масы комсамольцаў на барацьбу з конкрэтнымі праявамі правага ўхілу ў практычнай рабоце шэрагу організацый; НКЗ, Белсампрамсаюзу, Наркомасьветы.

У час асабліва вострай барацьбы партыі з нацыянал-дэмократызмам (тэатральная дыскусія, контррэволюцыйны ліст трох беларускіх пісьменьнікаў), газэта зусім слаба вяла барацьбу з гэтымі праявамі, зусім слаба мобілізавала ўвагу комсамольцаў, беспартыйнай працоўнай моладзі на барацьбу з імі.

Самакрытыка, якая зьяўляецца магутнай зброяй партыі ў барацьбе з ухіламі, ня была шырока разгорнута на старонках „Чырвонай Зьмены".

Рашуча выпраўляючы і зьнішчаючы меўшыя месца ў нас памылкі, няпрымірыма змагаючыся з усялякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі, концэнтруючы агонь на правым опортунізьме, як больш небясьпечным на даным этапе, не паслабляючы барацьбы з „левымі" загібамі і прымірэнцтвам да іх, разгортваючы няпрымірымую бальшавіцкую самакрытыку не зважаючы на асобы, мобілізуючы масы комсамольцаў і беспартыйнай рабочай моладзі на выкананьне пастаноў ЦК КП(б)Б і ЦК УсеЛКСМ аб рабоце камсамолу Беларусі,—газэта правяла значную работу па зьнішчэньню меўшых месца прарываў і значна дапамагла комсамольскай організацыі ў перабудове сваёй работы ў адпаведнасьці з важнейшымі політычнымі задачамі, якія стаяць перад комсамолам Беларусі.

Тварам да гаспадарчага будаўніцтва

Выходзячы з асноўнай ўстаноўкі партыі і Саюзу аб тым, што комсамол усёй сваёй масай павінен павярнуцца тварам да гаспадарчага будаўніцтва, „Чырвоная Зьмена" разгортвае вялізарную работу па мобілізацыі мас комсамолу і беспартыйнай моладзі вакол гэтых пытаньняў. На конкрэтных прыкладах работы асобных ячэек (завод „Зорка", Тураўская організацыя, Менбуд, Нова-Беліца, Залінейная організацыя) і цэлага шэрагу іншых ячэек мы паказалі, як політычная тупасьць, закасьцянеласьць, руціна, штампоўшчына, бесправбудные дзяляцтва адсутнасьць самакрытыкі могуць прывесьці да опортуністычных дзеяньняў асобныя зьвеньні комсамольскай організацыі.

Соцыялістычнае спаборніцтва, якое пачалося па ініцыятыве комсамолу, было падхоплена газэтаю. Роля газэты заключалася ў тым, каб дапамагчы партыі і комсамолу організоўваць масы на шырокае разгортваньне соцспаборніцтва. Асьвятляючы самы ход соцспаборніцтва, газэта рашуча выкрывала бюрократаў, беспрабудных дзяляг, якія імкнуліся ўкласьці спаборніцтва ў бюрократычныя рамкі. Мы высьвятлялі шэраг фактаў (МББ чыгункі, завод „Чырвоная Зорка", МенАК АКСМБ і г. д.), якія сьведчылі аб тым, што частка актыву комсамолу, асобныя гора-гаспадарнікі, асобныя профбюрократы імкнуліся замазаць сутнасьць спаборніцтва, зьвесьці яго да канцылярскай справы.

Аднак, ня гледзячы на гэтыя дадатныя бакі ў рабоце газэты, трэба зазначыць, што ў пытаньнях соцспаборніцтва газэта не змагла яшчэ даць даволі добрых вузораў работы з тым, каб шырока асьвятліць гэты становучы вопыт. Зусім нездавальняюча пастаўлена работа па асьвятленьню соцспаборніцтва ў савгасах і колгасах.

Ударніцтва і прамфінплян

Мы ўпарта працавалі над тым, каб ударніцтва зрабілася сапраўды масавым рухам у рабоце комсамольскіх ячэек, каб комсамольскія ячэйкі сталі масавымі ініцыятарамі ўдарных цэхаў, ударных заводаў, ударных вытворча-бытавых комун. Нам прышлося рабіць цэлы шэраг выездаў на фабрыкі (Гомель, Бабруйск) з мэтай апісаньня вопыту работы ўдарных брыгад. Аднак, на сёньняшні дзень трэба прызнацца, што ня гледзячы на зьмяшчэньне шэрагу важнейшых матар'ялаў ударніцкага характару, мы ўсё-ж такі асьвятлялі толькі факты і не ў дастатковай меры зьяўляліся організатарамі ўдарніцкіх пытаньняў у рабоце комсамольскіх ячэек.

На конкрэтных прыкладах газэта паказала шкодвасьць ілжэўдарніцтва (Менбуд), як адсутнасьць кіраўніцтва ударным рухам з боку ячэек можа апошліць важнейшую карысную справу для соцыялістычнай вытворчасьці.

Асьвятляючы матар'ялы асобных прадпрыемстваў па выкананьню імі прамфінпляну, газэта ўзяла курс на тое, каб паказаць выкананьне прамфінпляну ў разрэзе трэстаў і асобных гаспадарчых аб'яднаньняў. Мы гэта зрабілі па мэталя і шклотрэсьце, паказалі на прыкладах абутковай фабрыкі, заводу „Комунар", „Пролетарыя", фабрыкі „Днепр" і „Энэргіі", і іншых заводаў як косьнасьць, політычная тупасьць, спасылка на об'ектыўныя прычыны зрываюць выкананьне прамфінпляну.

Зараз рэдакцыя робіць масавы агляд віцебскіх прадпрыемстваў пад кутом погляду ўдзелу комсамольскай організацыі ў выкананьні прамфінпляну і наколькі вытворчыя ячэйкі перабудавалі свой зьмест і мэтады работы ў адпаведнасьці з задачамі гаспадарчага будаўніцтва.

Бесьперапынны рабочы тыдзень паставіў у асаблівыя ўмовы работу комсамольскіх ячэек. Перад намі, як газэтай, паўстала пытаньне, як перабудаваць усю сваю работу ў адпаведнасьці з бесьперапынкай. Мы пачалі на сваіх старонках абгаварэньне гэтага пытаньня. Аднак, на вялікі жаль, мы вопыту работы не прыпаднесьлі. Гэта тлумачыцца яшчэ і тым, што нашы кіруючыя комсамольскія організацыі, АК, РК, колектывы, ячэйкі амаль зусім не абменьваюцца вопытам на старонках нашай газэты. Комсамольскі-ж актыў на адкрытую намі дыскусію не адгукнуўся.

Барацьба за пролетарскіе кадры

Мы ўзьнялі шэраг пытаньняў зьвязаных з будаўніцтвам школ ФЗВ, як лепшай формай падрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы. Узьнялі шэраг пытаньняў, зьвязаных з працай і адукацыяй рабочай моладзі, якая працуе ў шкляной прамысловасьці. Узьнялі пытаньне аб перабудове школ ФЗВ, аб вячэрняй і тэхнічнай асьвеце.

Аднак, гэтыя пытаньні патрабуюць далейшай упартай прапрацоўкі ва ўсёй рабоце газэты, з тым каб мобілізаваць масы комсамольцаў на іх ажыцьцяўленьні.

Газэта і колгаснае будаўніцтва

Задачы, пастаўленыя партыяй у галіне колектывізацыі сельскай гаспадаркі і на аснове суцэльнай колектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як клясы, займаюць у рабоце газэты адно з важнейшых месц.

Рашучым чынам дабівалі прышчэпаўшчыну

Упарта праводзячы лінію партыі па колектывізацыі, перад газэтай ва ўсю шырыню паўстала неадкладнае пытаньне, каб рашучым чынам дабіваць прышчэпаўшчыну. Газэта ставіла перад сабою задачу асьвятліць становучы вопыт Клімавіцкай раённай організацыі комсамолу па колектывізацыі з тым, каб перанесьці яго ў другія раёны. Мы правялі цэлы шэраг нарад (Талочын, Аршаншчына, Талька) спэцыяльна па пытаньнях удзелу комсамольскіх ячэек у рабоце па колектывізацыі. Рэдакцыя паслала корэспандэнтаў у буйныя колгасы з мэтай вывучэньня вопыту работы комсамольскіх ячэек па ўнутранай організацыі работы ў колгасах, разгортваньню соцспаборніцтва, на перабудове ўсёй работы вясковых ячэек у адпаведнасьці з важнейшымі палітычнымі задачамі. Гэты вопыт мы асьвятлілі на старонках нашай газэты. Аднак, было-б вялізнай памылкай лічыць, што мы можам „выехаць" на нашых спэцкорах. Тут патрэбна шырокая актыўнасьць юнкораўскіх мас. Мы паставілі задачу організаваць юнкораўскія брыгады ва ўсіх колгасах і савгасах. У бліжэйшы час гэтае пытаньне будзе спэцыяльна распрацавана. Вопыт гэтай работы сябе поўнасьцю апраўдаў.

Вясеньняя сельска-гаспадарчая кампанія

Увязваючы пытаньні суцэльнай колектывізацыі з вясеньне-пасеўнай кампаніяй, газэта чотка ставіла пытаньне аб задачах комсамольскіх ячэек у вясеньняй сельска-гаспадарчай кампаніі. Газэта выступіла супроць няправільнага тлумачэньня задач сельска-гаспадарчай кампаніі, якія рэкомэндаваліся ў кніжцы „Бальшавіцкім тэмпам", паказала комсамольскай організацыі практычнае ажыцьцяўленьне тых задач, якія стаяць перад комсамолам.

У тэй вялічэзнай рабоце, якую праводзіла газэта па правядзеньню лініі партыі ў соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі, мы рашуча змагаліся з праявамі правага ўхілу і „левых" загібаў у гэтай рабоце. Няпрымірымай бальшавіцкай самакрытыкай ускрывалі і выпраўлялі тыя памылкі, якія мелі месца ў асобных зьвеньнях комсамольскай організацыі, а ў асобных выпадках і ў самой газэце.

На прыкладах клясавай барацьбы мы загартоўвалі шэрагі комсамолу

Шпаркія тэмпы нашага соцыялістычнага будаўніцтва, рашучае выкарчоўваньне карэньняў капіталізму, выклікаюць абвастрэньне клясавай барацьбы і на ідэолёгічным фронце. Асноўная ўстаноўка газэты заключалася ў тым, каб на конкрэтных прыкладах клясавай барацьбы яшчэ больш загартаваць шэрагі комсамолу. Мы апублікавалі лісты Сяргеенкі, Кізеева, у якіх паказалі сапраўдны твар кулацкіх падпявалаў, выпадкова пралезшых у комсамол. Газэта рашуча выступіла супроць кніжкі М. Зарэцкага, у якой поўнасьцю адбівалася кулацкая ідэолёгія. Мы паказалі шэраг фактаў няўменьня кіраўніцтва паасобных організацый мобілізаваць шырокія масы працоўнай моладзі на важнейшыя вучасткі соцыялістычнага будаўніцтва (Крупкі, Аршаншчына, Мазырскі АК і г. д.).

Трохмесячнік беларускай і нацменаўскай пролетарскай культуры

Абвешчаны ЦК ЛКСМБ трохмесячнік беларускай і нацменаўскай пролетарскай культуры зьяўляецца важнейшым політычным актам у рабоце комсамолу Беларусі. З моманту абвяшчэньня трохмесячніку газэта пачала весьці упартую сыстэматычную растлумачальную работу аб значэньні і задачах трохмесячніку. Газэтай выпускаецца спэцыяльная старонка трохмесячніку.

Мы зрабілі налёт на профсаюзы і іншыя ўстановы Менску з мэтай праверкі, як яны праводзяць работу па трохмесячніку; зрабілі налёты на менскія клюбы і дзяржаўную бібліотэку, маючы на ўвазе высьветліць, як гэтыя ўстановы перабудоўваюць сваю работу ў адпаведнасьці з тымі політычнымі задачамі, якія стаяць перад імі у сучасны момант. Выпусьцілі 4 спэцыяльныя старонкі, прысьвечаныя праверцы выкананьня організацыяй задач партыі адносна беларусізацыі. Газэта, ні на хвіліну не паслабляючы барацьбы з праявамі рознага роду шовінізму і антысэмітызму, на сваіх старонках бязьлітасна выкрывала іх клясавую сутнасьць і давала правільную політычную ацэнку.

У час трохмесячніку беларускай і нацменаўскай пролетарскай культуры, з мэтай популярызацыі перад масамі комсамольцаў і беспартыйнай працоўнай моладзі пролетарскай музыкі, рэдакцыя газэты сумесна з Беларускім радыё-цэнтрам правяла спэцыяльную лекцыю; „як слухаць і разумець музыку". З мэтай паказу на колькі „продукцыя" музычных устаноў зьяўляецца сугучнай нашай эпосе, мы асьвятлялі работу Белдзяржмузтэхнікуму, беларускай капэлі і г. д.

З мэтай асьвятленьня работы комсамольскай організацыі ў галіне ліквідацыі няпісьменнасьці, газэта падала цэлы шэраг матар'ялаў, але ўсё-ж такі трэба адкрыта заявіць, што гэты фронт вельмі мала намі закрануты.

Мы своечасова сыгналізавалі перад організацыяй небясьпеку дзяляцкага падыходу пры правядзеньні трохмесячніку ў Магілеве, дзе ўсе задачы былі зьведзены да барацьбы з пудрай.

„Лёгкая кавалерыя"—у атаку

На працягу ўсёй сваёй дзейнасьці газэта праводзіць надзвычайна вялікую работу ў барацьбе з бюрократызмам. „Чырвонаа Зьмена" накіроўвала свой агонь на конкрэтных носьбітаў зла, безгаспадарнікаў і лжэ-спэцыялістых. бюрократаў, галавацяпаў і г. д. Разам з гэтымі дадатнымі бакамі трэба зазначыць, што мы яшчэ вельмі мала закранулі самакрытыкай комсамольскія організацыі. Толькі за апошні час мы ўскрылі шэраг прарываў у паасобных зьвеньнях комсамольскай організацыі.

Нельга прайсьці і міма фактаў, якія значна перашкаджалі рабоце газэты, цкаваньня яе з боку часткі актыву менскай організацыі пры ўдзеле часткі членаў бюро акругкому. Яны імкнуліся глушыць самакрытыку, якая разгорталася газэтай. Толькі ЦКК РСІ, якая ўмяшалася ў гэтую справу, дала належную політычную ацэнку і дала па галаве тым, хто імкнуўся заціснуць самакрытыку ў друку.

За апошнія 8 месяцаў газэта выпусьціла 17 старонак „Лёгкай кавалерыі" у дапамогу органам РСІ. Па юнкораўскіх і „кавалерыскіх" допісах за розныя злоўжываньні і скрыўленьні клясавай лініі 62 чалавекі адданы пад суд, 21 чалавек зьняты з працы, 52—вычышчаны з навучальных устаноў, па 76 допісах прыняты іншыя крокі.

Наша задача цяпер—гэта згрупаваць вакол сябе ўвесь актыў „ЛК" пад лёзунгам:—няма „кавалерыстага" не рабкора.

Тыражна-масавая работа

Зараз у нас налічваецца больш 1.000 юнкораў, мы праводзім якасны вучот іх, але сталых вынікаў яшчэ няма. Маюцца юнкораўскія брыгады ў Гомэлі і Віцебску і ў некалькіх колгасах.

Пастанова ЦК ЛКСМБ аб спэцыяльных упаўнаважаных пры ячэйках амаль выканана, але наглядаецца такое зьявішча, што на гэтую працу вылучаюць таварышоў, якія ёю ня цікавяцца. Бываюць пры распаўсюджваньні газэты і такія заявы: „як мы будзем распаўсюджваць „Чырвоную Зьмену", калі комсамольцы ня ведаюць беларускай мовы?". З мэтай правядзеньня адпаведнага пералому ў рабоце ўпаўнаважаных, рэд. з 1 мая пачала работы ўсіх упаўнаважаных,—ўпаўнаважаныя будуць прэміяв

Рэдакцыяй праведзена конфэр чытачоў „Ч. З." у шэрагу бел гарадоў і мястэчак (на буйных прыемствах, савгасах, колгасах і Таксама была наладжана су чырвонаармейцаў з музыкамі і вакамі, праведзен дыспут аб па соцыялістычных гарадоў і дамо мун. 15 мая будзе праведзена сія працоўнай моладзі па марш Гомель,–Кіеў–Днепрабуд.

Ня гледзячы на пастанову ЛКСМБ аб давядзеньні тыражу ты да 25 тысяч, дагэтуль ён не высіў 23 тысяч. Цяпер нават дзецца ўпадак.

Віна ў гэтым кладзецца на мольскія ячэйкі, якія праводзя выстарчальную у гэтым напрам боту.

Нашы задачы

Упарта і энэргічна ажыцьця генэральную лінію партыі хоўваючы ў яе духу шырокія комсамольцаў і беспартыйнай р моладзі,—газэта павінна яшчэ гічней, больш упарта працава тым, каб усямерна дапамагчы мольскай організацыі перабу сваю работу ў адпаведнасьці з задачамі, якія зараз пастаўлены ленінскім комсамолам.

Газэта ў далейшым павінна больш упарта выкрываць і б правых і „левых" опортуністы імкнуцца сьцягнуць партыю з скага шляху.

У нацыянальным пытаньні, труючы агонь на беларускім нал-дэмократызьме і опортунізь больш небясьпечным, выкры яго контррэволюцыйную ідэ газэта павінна будзе не пас барацьбы з рознага роду шові (вялікадзяржаўны, расійскі, яў польскі і г. д.), выкрываючы савую сутнасьць, загартоўваю рагі комсамолу ў ленінскім дух

Разгортваць у далейшым бяз ную бальшавіцкую самакрыты зважаючы на асобы, рашуча рвачох, гультаёх, бюрократах, ках і лжэ-ударніках, па усіх ты перашкаджае нашаму пасьп соцыялістычнаму будаўніцтву.

Газэта павінна ўсямерна ор ваць і дапамагаць комсамолу нізацыі актыўнасьці беспар працоўнай моладзі, у накіра па шляху соцыялістычнага бу тва, за індустрыялізацыю кра цэльную колектывізацыю, на не—ліквідацыю кулацтва як Загартаваць шэрагі комсамолу савых бойках, быць на перада зыцыях клясавай барацьбы, гаспадарчым, так і на ідэол фронце—вось нашы баявыя за

Факты падцьвердзіліся

Факты, якія былі ўказаны ў заметцы, зьмешчанай у „Чырвонай Зьмене" ад 1 сакавіка г. г. пад загалоўкам: „Адна ўжо кінула работу", расьсьледваньнем спэцыяльнай камісіі, вылучанай ячэйкай КСМ школы Будвуч (Менск), цалкам падцьвердзіліся. Камісія знашла, што некаторыя таварышы, як: Сьляпян, Зільбэрг, Танкус, Браніцкі, Клябанаў, Мінькоў і інш. сыстэматычна зьдзекваліся над дзяўчатамі школы шляхам „мастацкага красамоўя", адборнай лаянкай, „культурнымі" песенькамі і інш. Бюро ячэйкі, заслухаўшы вынікі камісіі, вынесла гэтым таварышом належныя комсамольскія спагнаньні. Некаторыя таварышы, замест дапамогі адсталым у рабо чатам адмежаваліся зласьлі сьмейваньнем і шыпучым ваньнем.

Старшыня „Лёгкай кава Клябанаў, якому было да расьсьледваньне гэтай заметкі, сябе скрыў і ўзяў пад крыльца судзельніка гэтай вы, свайго добрага тавар Зільбэрга.

100-процантная падпіска самольцаў на «Чырвоную ну» і дружны адпор з ўсёй школы Будвуч да зарваўшыхся комсамо вось наш адказ на под гэтых таварышоў.

Ан

9-га мая, а 7-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні рэ цыі газэты „Чырвоная Зьмена" адбудзецца першы збор ат ду „ЛК" пры „Чырвонай Зьмене".

Запрашаюцца: т. т. Чарняк, Казлоў, Голубоў А., шэнка С. („Энэргія"), Новікаў, Барозка, Гарнашэвіч (будаў Бабоўнікаў, Шэндаровіч („Комунар"), Норкіна („Швэйпром таксама жадаючыя працаваць ў атрадзе „ЛК" пры газэ

Рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмен

ДА ПЛЕНУМУ ЦК ЛКСМБ

ОРГАНІЗУЕМ ДЗІЦЯЧУЮ ПРАЦУ Ў КОЛГАСАХ

Праца павінна служыць ня тольki сродкам павялічэньня грамадзкай вытворчасьці, але і сродкам выхаваньня і ўсебаковага разьвіцьця. Праца павінна даць звычкі і веды, разьвіваючы ў дзяцей матэрыялістычны сьветапогляд

„Цесна ўвязваць працу з вучэбнай і навукова-дасьледчай працай" (КРУПСКАЯ)

ПРАЦЯГВАЕМ АБГАВАРЭНЬНЕ ПЫТАНЬНЯ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ОРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ Ў КОЛГАСАХ

Проэкт

Часовыя правілы аб працы дзяцей і падлеткаў у колгасах

Курс партыі на соцыялістычную рэконструкцыю сельскай гаспадаркі на базе яе колектывізацыі, на практыцы узьняўшы да гіганцкіх памераў колгасны рух у краіне, усё ўзрастаючы ахват суцэльнай колектывізацыяй цэлых экономічных раёнаў, карэнным чынам мяняе ўмовы і процэсы вядзеньня сельскай гаспадаркі.

Умовы буйных колектыўных гаспадарак ствараюць магчымасьць ставіць пытаньне аб соцыялістычнай організацыі юнацкай працы ў сельскай гаспадаркі.

Гэта дае падставы абмеркаваць стварэньне новых кадраў для колектывізаванай сельскай гаспадаркі праз дакладныя формы навучаньня (школы колгаснай моладзі і г. д.), „пры якіх навучаньне пэўнай спэцыяльнасьці зьвязана з вытворчай працай падлеткаў, вядзецца ў процэсе самой вытворчасьці і дапаўняецца выкладаньнем тэорытычных прадметаў, якія спрыяюць уцямленьню процэсаў вытворчасьці як у тэхнічных, так і ў грамадзкіх адносінах і спэцыяльнымі (клюбнымі) заняткамі, якія дапамагаюць выяўляцца і фармавацца творчай нахільнасьці падлетка, а таксама фізічным выхаваньнем, спрыячым падрыхтоўцы здаровых целам працаўнікоў і баразьбітоў" (з програмы УсеЛКСМ).

Аднак, павышэньне соцыялістычных элемэнтаў у організацыі юнацкай працы ў колгасах магчыма тольki па меры гаспадарчага ўмацаваньня, павышэньня ўдзельнай вагі, абагуленага сэктару і падвядзеньня тэхнічнай базы пад колгасы.

На данай стадыі разьвіцьця колгасаў, улічваючы іх экономічную моц і г. д., ЦК УсеЛКСМ лічыць НЕАБХОДНЫМ НАДЗВЫЧАЙНА АСЬЦЯРОЖНЫ ПАДЫХОД да практычнага вырашэньня пытаньня соцыялістычнай організацыі працы падлеткаў і дзяцей у колгасах і лічыць, што на БЛІЖЭЙШЫ ПЭРЫОД у аснове працы комсамольскіх організацый па організацыі працы дзяцей і падлеткаў павінны быць праведзены наступныя мерапрыемствы, разьлічаныя на ўжываньне сельска-гаспадарчай арцелі:

1. Улічваючы асаблівасьці ўмоў сельскай гаспадаркі ў адрозьненьне ад норм узросту прынятых у прамысловасьці, ЦК УсеЛКСМ выказваецца за ўстанаўленьне наступных норм узросту ў сельскай гаспадарцы прыстасавальна да абодвых палоў:

а) дзіцячы ўзрост—да 12 год;

б) падлеткавы ўзрост—ад 12 да 16 (з падзяленьнем на групы: ад 12 да 14 і ад 14 да 16 год).

2. Праца дзяцей павінна насіць выключна вучэбна-вытворчы характар, падначальваючы яе задачам політэхнічнага выхаваньня, дзеля гэтага, уцягваючы дзяцей з 8-гадовага ўзросту ў вучэбна-вытворчую працу праз організацыю школамі сумесна з піонэрскімі атрадамі дзіцячых брыгад, будуюць гэтую працу, выходзячы з агульна-вытворчага пляну колгасу ў злучэньні з агульна-адукацыйнай вучобай.

Матар'яльная каштоўнасьць, створаная вучэбна-вытворчай працай дзяцей да 12-цігадовага ўзросту, павінна паступаць у маючыйся фонд для абслугоўваньня культурна-бытавых патрэб дзяцей, у першую чаргу па лініі абагуленьня дзіцячага быту (харчаваньне, дзіцячыя пляцоўкі і г. д.).

3. Працу падлеткаў неабходна максымальна падначаліць задачам організаванага навучаньня, злучыўшы атрыманьне імі агульна-адукацыйных і спэцыяльных ведаў, выходзячы з асноўнай задачы—падначаленьня працы падлеткаў задачам політэхнічнай адукацыі.

4. Працоўны дзень падлеткаў узросту ад 12 да 14 год павінен мець працягласьць ня больш 6 гадзін, і ад 14 да 16,—працягласьць ня больш 8 гадзін (з устанаўленьнем пэрыоду дня, калі яго можна ўжываць—раніцай, упоўдзень, вечарам і г. д.), дапускаючы павялічэньне рабочага дня падлеткаў (ад 14 да 16 год), у пэрыоды максымальнага разгару сельска-гаспадарчай працы, але ня больш, чым на дзьве гадзіны, выключаючы дзяўчынак-падлеткаў гэтага ўзросту.

УВАГА: 1. Паказаная працягласьць рабочага дня падлеткаў не распаўсюджваецца на падсобныя гаспадарча-рамесьніцкія прадпрыемствы і майстэрні (кузьні, рамонтныя) базы і г. д., бо ў апошніх працягласьць рабочага дня падлеткаў выключаецца таксама, як і ў прамысловасьці.

2. У гэтых-жа прадпрыемствах і падлеткавы ўзрост устанаўляецца той-жа, што і ў прамысловасьці.

3. Устаноўлены лік працоўных гадзін падлеткаў у надыходзячыя сельска-гаспадарчыя і палявыя работы, маюць на мэце запаўненьне іх фізычнай працай, але ў далейшым, пры распрацоўцы і пастаноўцы організаванага ахопу падлеткаў вучнёўствам (усімі відамі), а таксама, дзе гэта навучаньне ўжо маецца (ШКМ), у гэты лік рабочага дня падлеткаў павінен уваходзіць і час іх тэорэтычнай вучобы.

5. Аплата працы падлеткаў пры выкананьні імі аднолькавай працы з дарослымі павінна вытварацца па тых-жа расцэнках, што і дарослым, без даплаты за скарочаны рабочы дзень, ажыцьцяўляючы прынцып—за роўную працу—роўную аплату.

Агульная выпрацоўка падлеткаў на тых работах, на якіх праца падлеткаў дапушчаецца,—вызначаецца ўстаноўленай працягласьцю працоўнага дня падлеткаў: 12-14—14-16 год.

6. ЦК УсеЛКСМ лічыць неабходным у комунах і арцелях устанаўленьне разьліковай кніжкі на кожнага працуючага падлетка, замест практыкі ўстанаўленьня разьлікаў на імя главы сям'і.

Ахова працы і здароўя

Ужываньне працы падлеткаў ад 12 да 16 год павінна быць на больш лёгкіх работах, кіруючыся пры гэтым орыентовачным сьпісам работ, забароненых для падлеткаў. Пашырэньне гэтага сьпісу на мясцох павінна вытварацца комсамольскімі організацыямі, на падставе вучоту шкоднасьці работ, для падлеткаў у спэцыфічных умовах тэй альбо іншай галіны сельскай гаспадаркі і ўстанаўляецца сумесна з праўленьнем арцелі па ўзгадненьню з сэкцыяй працы сельсавету. Да асеньняй пасеўкампаніі павінен быць распрацаваны сьпіс цяжкіх і шкодных работ, забароненых для падлеткаў, з устанаўленьнем у савецкім парадку прыстасавальна да тыпаў гаспадарак і ўзростных груп, асобна для 12-14 і 14-16 год.

ЦК УсеЛКСМ.

Мае заўвагі да артыкулу т. Вербалозы

У „Чырвонай Зьмене" ад 28 красавіка, зьмешчан артыкул: „Як організаваць працу дзяцей у колгасах".

Па-мойму, у артыкуле Вербалозы, побач з шэрагам практычных прапаноў організацыі працы ў колгасах ёсьць і непадыходзячыя мерапрыемствы, асабліва ва ўмовах Беларусі, а іменна:

Па-першае: „Забараніць скарыстоўваньне працы падлеткаў у колгасах да 13-гадовага ўзросту не ў парадку школьнай практыкі. Улічваючы малую матар'яльную базу колгасаў, гэты тэрмін неабходна скараціць на год, г. зн., забараніць работу падлеткаў да 12-гадовага ўзросту.

Па-другое: Да 12 гадовага ўзросту неабходна лічыць не падлеткавыя групы, а дзіцячыя і дзеля гэтага дзіцячая група не павінна працаваць ў вытворчасьці колгасу, а дапускаецца толькі ў парадку школьна-вытворчай практыкі".

Яшчэ з чым немагчыма згадзіцца, гэта, каб падлеткам колгасаў даплачвалі за недапрацаваныя 4 гадзіны па стаўках нормальнага рабочага, што ў колгасах немагчыма. Аўтар артыкулу мэханічна пераносіць практыку вытворчай працы, ня ўлічваючы ўмоў і магчымасьцяй колгасу.

У галіне сеткі падлеткаў аўтар артыкулу, не разьмеркаваўшы па групах дзяцей і падлеткаў, даў ім сетку аднолькавую, што блытае справу. Падлеткавыя групы гэта тыя, што вучацца ў школах ШКМ, брыгаднага і індывідуальнага вучнеўства спэцыяльна сельска-гаспадарчаму рамяству, а дзіцячыя—гэта тыя групы, якія атрымліваюць адукацыю, наогул. Такім чынам выходзіць, што аўтар складаў сетку для тых, каму ён сам у сваім артыкуле забараняў працаваць. А па-другое,—мэханічна перанёс сетку з прамысловасьці, дзе аплата рабочага і падлетка знаходзіцца ў адносінах 1 рубель да 0,6 рубля.

К—ў.

РЭДАКЦЫЯ ВЫКЛІКАЕ

Зьмяшчаючы на абгаварэньне матар'ял аб організацыі працы дзяцей і падлеткаў у колгасах, рэдакцыя газэты зварочваецца да ЦСПСБ, саюзу сельгаслесрабочых, Колгасцэнтру, Наркампрацы, Наркомасьветы, Наркомздароўя і пэрсанальна да т. т. Палякова, Рындзіча, Шоламава, Азаронка, Рамізэвіча, Буклей прыняць удзел у абгаварэньні гэтага пытаньня, прыслаўшы ў рэдакцыю свае прапановы.

Да ведама студэнтаў завочнікаў

Дэканат менскага завочнага рабфаку даводзіць да ведама студэнтаў, што з 20 па 25 мая г. г. адбудзецца праверка ведаў студэнтаў і конфэрэнцыя з акадэмічна адсталымі таварышамі.

Для атрыманьня літара з 50-проц. скідкай па чыгунцы ўсім студэнтам да вызначанага тэрміну неабходна хутка паведаміць рабфак аб прыезьдзе на конфэрэнцыю альбо для праверкі ведаў. Адначасова паведаміць назву чыгуначнай станцыі, з якой патрэбна выяжджаць, палустанку і разьезду пісаць ня трэба.

Нам. дэкана рабфаку ЯКАЎЛЕЎ.

Як організаваць дзіцячую працу ў колгасах

Організацыя дзіцячай працы ў колгасах—справа новая і бязумоўна, што ў ёй ёсьць і будуць некаторы час адхіленьні ад правільнага вырашэньня.

Наглядаецца масавае ўжываньне дзіцячай працы с 10 гадовага ўзросту і маладзей, з працоўным днём, роўным дню дарослага рабочага і з няроўнай аплатай за раўную працу.

Побач з гэтым, кіраўнікі некаторых калгасаў упадаюць у другую крайнасьць—ня ўжываюць зусім дзіцячай працы да 16 год, утрымліваючы падлеткаў за кошт колгасу. Як першая пастаноўка, так і другая ў корні няправільная і іх патрэбна выправіць.

Асноўная задача організацыі працы моладзі—гэта ўтварэньне кваліфікаванай, політычна разьвітай зьмены, якая павінна будзе даць патрэбныя кадры для далейшага разьвіцьця і ўмацаваньня колгаснага будаўніцтва.

Толькі так, у адпаведнасьці з рашэньнямі лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б), магчыма ставіць пытаньне.

Каб правільна паставіць організацыю дзіцячай працы ў колгасах, мы павінны скарыстаць некаторую практыку з організацыі дзіцячай працы ў прамысловасьці. Аднак, ні ў якім разе мэханічна не пераносячы гэткай на калгасы. Спэцыяльныя ўмовы сельскай гаспадаркі, патрабуюць падзяліць моладзь на наступныя групы па ўзросту: да 12 год—дзіцячая, а ад 12 да 16—падлеткавая.

Да 12-ці год утрымліваць за сродкі колгасаў

Асноўнай прадпасылкай правільнага скарыстаньня дзіцячай працы і ўвязкі яе з вучобай зьяўляецца абавязковасьць утрыманьня дзяцей да 12-цігадовага ўзросту за кошт колгасаў. Гэта абмяжуе многіх сялян у пасылцы дзяцей на працу для павялічэньня сваіх матар'яльных рэсурсаў і дасьць магчымасьць забараніць дзіцячую працу па-за межамі школьна-вытворчага пляну.

Прынцып утрыманьня дзяцей за кошт колгасаў павінен у першую чаргу ахапіць дзяцей беднякоў і батракоў.

Абмежаваць працоўны дзень

Неабходна практычна абмежаваць працоўны дзень дзяцей і падлеткаў прыкладна наступным парадкам: да 12 год забараніць усякае ўжываньне дзіцячай працы паміма школьна-вытворчага пляну, якім устанавіць рабочы час у адпаведнасьці з часам вучобы. Для вучняў ШКМ рабочы час мэтазгодна ўстанавіць не па ўзросту, а ў дапасаваньні да пары году ў адпаведнасьці з днямі вучобы, з такім разьлікам, каб зімой пераважвала вучоба, а ўлетку—практыка.

Для індывідуальнага вучнёўства неабходна ўстанавіць рабочы дзень ня звыш 6 гадзін ва ўзросьце ад 12 да 14 год і ня звыш 8 гадзін—ад 14 да 16 год. Рабочы дзень пры гэтым узімку і ўлетку павінен рэгулявацца ў залежнасьці ад сьпешнасьці працы данага сэзону, але ў межах паказанае нормы.

Моладзь, якая ў бліжэйшай будучыні ня будзе ахоплена ні ШКМ, ні школай першай ступені, ні сыстэмай сельгасвучнёўства, таксама павінна мець абмежаваны рабочы дзень у больш рэзкіх формах, што паспрыяе хутчэйшаму ўключэньню яе ў сыстэму вучнёўства. Прыкладна так: ад 12 да 14 год рабочы дзень ня можа перавышаць 4 гадзін, а ад 14 да 16—6 гадзін.

Такое-ж абмежаваньне рабочага дня павінна распаўсюджвацца і на жаночую працу.

Аплата працы

Наяўнасьць фактаў скарыстаньня працы падлеткаў без усялякага абмежаваньня рабочага дня, няроўнасьць аплаты за працу аднолькавай цяжкасьці патрабуюць захаваць прынцып роўнае аплаты за роўную працу, ня ўвязваючы гэта з тым, што падлеткі вучацца ў школе, альбо зьяўляюцца вучнямі сельгасвучу, ШКМ, ні з іх вытворчай практыкай.

Колгасная вучнёўская сетка

Для правільнай пастаноўкі вучнёўскае сеткі неабходна ўзяць вопыт з сеткі падлеткаў прамысловых рабочых. Гэта практыка (а не мэханічны паранос яе) дасьць правільны напрамак вырашэньня пытаньня.

Вучнёўская сетка павінна ахапіць сабою як вучняў ШКМ, так і брыгаднае і індывідуальнае вучнеўства ў суадносінах нармальнай колгаснай сеткай.

Сетка павінна мець два варыянты ў залежнасьці ад тэрміну навучэньня ў ШКМ і сельгасвучнёўства.

Увядзеньне рабочай сеткі зьяўляецца неабходным выходзячы з наступных меркаваньняў:

Вучнёўства організуецца ў тых галінах сельскай гаспадаркі, дзе навучаньне патрабуе больш доўгага часу (як правіла), дзеля гэтага вытворчасьць і якасьць працы вучня будзе нізкай у пачатку і вучань будзе ў дрэнным матар'яльным становішчы, паколькі ў нас асноўная аплата працы—зьдзельная.

Па-другое, устанаўленьнем для для вучняў аплаты ў адпаведнасьці з лікам і якасьцю працы будуць імкнуцца да ўсямернага павялічэньня выпрацоўкі на пагубу сваёй вучобе.

Вось чаму вучнёўская сетка зьяўляецца неабходнай. Зьдзельная аплата працы падлеткаў занятых вучобай павінна прымяняцца тольki тады, калі вучні вучацца ўжо апошняе паўгодзьдзе ў школе, а неахопленыя вучобай падлеткі павінны пераводзіцца на зьдзельную працу не раней, чым ад 14-15 гадовага ўзросту.

Аплата працы падлеткаў

Зусім няправільна было-б не аплачваць працу дзяцей да 12-гадовага ўзросту, якія працуюць згодна іх школьна-вытворчаму пляну, хаця і ўтрымліваюцца за кошт колгасу. За іх працу неабходна ўстанавіць аплату, што ўзьніме іх зацікаўленасьць працаю і актыўнасьць да яе, але гэтыя грошы ня трэба выдаваць ім на рукі, а перапісаць у фонд школы, піонэратраду і г. д.

Аховы працы дзяцей

Ахова працы патрабуе не дапускаць дзяцей і падлеткаў да цяжкай працы і праз кожныя дзьвятры гадзіны падлетак павінен мець перапынак для адпачынку. А таксама неабходна ўстанавіць пэрыодычную мэдыцынскую праверку і нагляд за працай падлеткаў у колгасах: пасылка іх на спэцыяльнае курортнае лячэньне, у дамы адпачынку і г. д.

КІСЯЛЁЎ.

Вячэрні ВТНУ ў Менску

У сувязі з вялікім патрабаваньнем новых кадраў спэцыялістаў, прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў організаваць пры ўноўзаснаваным ВТНУ—вячэрні ВТНУ.

Гэта мерапрыемства дасьць магчымасьць тэхнікам, якія зараз працуюць на вытворчасьці падвысіць сваю кваліфікацыю, не адрываючыся ад вытворчасьці.

Сэктару кадраў пры ЦСПСБ разам з іншымі зацікаўленымі організацыямі і ўстановамі даручана распрацаваць пытаньне па забесьпячэньню вячэрняга ВТНУ выкладчыкамі і ўстанавіць парадак прыёму ва ВТНУ з такім разьлікам, каб забясьпечыць пролетарскі склад студэнцтва.

Чыстка выпускнікаў ВНУ і тэхнікумаў

ЧЫСТКА МАЦУЕ КЛЯСАВУЮ БАЯЗДОЛЬНАСЬЦЬ КОМСАМОЛУ

Па-бальшавіцку ачысьціць шэрагі ленінскага комсамолу ад клясава-чужых нам элемэнтаў, зьняць мяшчанска-абывацельскую цьвіль, якая пакрывае асобныя каморкі здаровага комсамольскага арганізму

Не апашляць палітычных задач чысткі

21 красавіка пачалася праверка комсамольцаў выпускных курсаў Рагачэўскага Белпэдтэхнікуму і пэдкурсаў. Першыя паседжаньні камісіі паказалі, што комсамольскім колектывам тэхнікуму праароблена сур'ёзная і сталая падрыхтоўчая работа. Навакол задач чысткі складзена шырокая грамадзкая думка як сярод студэнцтва, курсантаў, так і гарадзкой комсамольскай організацыі. Студэнцкая „Ільлічоўка" аддала шмат увагі пытаньню падрыхтоўкі да чысткі.

Кожнай комсамольскай ячэйкай складзены характарыстыкі сваіх-жа комсамольцаў. Вывешана скрынка для матар'ялу па чыстцы. Камісія па праверцы, узброеная матар'яламі папярэдняй падрыхтоўкі, нармальна і з вялікім посьпехам праводзіць сваю работу. Зацікаўленасьць чысткаю вельмі вялікая. На сход зьявіліся амаль усе студэнты, курсанты і комсамольцы вытворчых ячэек.

На сцэне тав. Церахава. Па соцыяльнаму становішчу яна серадн..чка. Кароценькі жыцьцяпіс... Працавала, даручаныя працы выконвала... спагнаньняў комсамольскіх і студэнцкіх ня мела, бацька быў у колгасе, але вышаў... На пытаньне—„як рэагавала Цэрахава на выхад бацькоў з колгасу", яна адказвае—„казала", „агітавала", а аб прычынах выхаду бацькоў з колгасу маўчыць. На пытаньне—што галоўнае ў працы комсамолу ў вёсцы, Цэрахава ня можа адказаць.

Маецца цэлы шэраг комсамольцаў, падобных да тав. Цэрахавай. Напрыклад, комсамолец Багамаз—таксама серадняк, нядбайна адносіцца да выкананьня сваіх грамадзкіх абавязкаў. У час высяленьня кулакоў зачыніўся ў пакоі і баяўся паказацца на вуліцу.

З боку некаторых таварышоў наглядаецца напляваецельскія адносіны да чысткі. Лічаць чыстку гульнёй, крычаць пры праверцы якоганебудзь комсамольца: „хопіць вам ужо яго мучыць!?" Некаторыя таварышы на чыстцы займаюць позыцыі нэйтральнасьці. Таксама ненармальным трэба лічыць і тое, што на чыстцы мала комсамольцаў з вытворчых ячэек і чырвонаармейцаў.

ТОЛЯ.

Чыстка праходзіць пры шырокім удзеле рабочай моладзі

Бюро комсамольскага колектыву Слуцкага Белпэдтэхнікуму яшчэ за месяц да чысткі пачала праводзіць падрыхтоўчую работу; вывешваліся аб'явы, былі зьмешчаны артыкулы ў „Ільлічоўцы", інформацыі на розных тэхнікумаўскіх сходах. І ў выніку заля Слуцкага гортэатру у час чысткі была перапоўнена студэнцтвам, рабочай моладзьдзю, чырвонаармейцамі і настаўніцтвам.

Справаздача сэкратара колектыву слухалася з напружанай увагай. Пасьля справаздачы выступіла шмат студэнтаў, рабочых і чырвонаармейцаў. Абгаварэньне паказала, што ячэйка выпускных курсаў у асноўным справілася з ускладзенымі на яе партыяй і комсамолам задачамі.

Маюцца значныя посьпехі на акадэмічным фронце, на фронце соцыялістычнай перабудовы вёскі і правядзеньня трохмесячніку беларускай і нацменаўскай пролетарскай культуры. Побач з дасягненьнямі ёсьць і шэраг недахопаў, недастатковая сувязь з вытворчымі ячэйкамі, невыкананьне некаторых пунктаў па соцспаборніцтву, наяўнасьць элемэнтаў ілжэўдарніцтва, з чым ячэйка зараз вядзе рашучую барацьбу.

Спрэчкі выявілі, што частка партыйна - комсамольскага актыву, асабліва 3-га курсу, знаходзіцца па-за ўдарніцкім рухам.

Першы дзень чысткі прайшоў пры ўдзеле шырокіх мас, рабочай моладзі чырвонаармейцаў, студэнцтва і настаўніцтва,

Э. КІПЕР.

Тут у справе падрыхтоўкі да чысткі злачынна бязьдзейнічаюць

Комсамольская ячэйка Гомельскіх чыгуначных пэдкурсаў зусім не праводзіць аніякай падрыхтоўчай работы да чысткі курсантаў апошняга курсу. Бюро абмежавалася вывешваньнем аб'явы і скрынкі для матар'ялаў. Гэта робіцца ў той час, калі ў рабоце курсаў і наогул сярод работы асобных студэнтаў-комсамольцаў меўся цэлы шэраг прарываў.

На 3-м курсе вучыцца 6 комсамольцаў, усе яны зічыліся актывістымі школы імя Сакуна, у якой зараз раскрыта шкодніцкая дзейнасьць. А што зрабілі гэтыя комсамольцы і чым яны дапамаглі выкрыцьцю фактаў шкодніцтва? З боку іх наглядаліся нядбайныя адносіны да вучобы і выкананьня грамадзкіх нагрузак.

Васіленка—студэнт комсамолец—удзельнічаў у антысэміцкай бойцы, адвільваў ад грамадзкай работы. Калі ён быў пасланы ў колгас, дык адтуль уцёк, адмаўляецца ўжываць беларускую мову. У часе перавыбараў бюро ўтварыў навакол сябе фракцыйную групоўку. Будучы старшынёю вучкому, заціскаў самакрытыку, зрываў нататкі ў насьценгазэце, груба адносіўся да дзяўчат,—глядзіць на дзяўчыну не як на таварыша, а як на самку. Сваім сымпатыям ён протэжыраваў пры выдачы стыпэндый. Прыяцель Васіленкі—сын заможнага серадняка—Малахаў, які зусім не карыстаецца аўтарытэтам сярод беспартыйных студэнтаў. Вучобай зусім ня цікавіцца. Політычна зусім няпісьменны.

Гарры.—

10-га мая, а 6-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні Нова-Барысаўскага рабочага клюбу (быўшы ЛЮКС) адбудзецца агульна-гарадзкая конфэрэнцыя юнкораў і чытачоў комсамольскіх газэт разам з упаўнаважанымі па падпісцы.

Парадак дня: 1. Становішча комсамольскага друку і далейшыя яго задачы (дакладчык-прадстаўнік „Чырвонай Зьмены"—тав. Самуцін).

2. Становішча падпіскі па Барысаўскім раёне.

БАРЫСАЎСКІ РК ЛКСМБ.

Сьпяшайцес

7 дзён засталося да экскурсыі

Д а в е д а м а

Кошт экскурсіі па Дняпры на аднаго чалавека, пачынаючы з Гомел з поўным абслугоўваньнем (праезд параходам, па чыгунцы, хар ваньне, інтэрнат, трамваі і інш.) — 46 руб. і без праезду па ч гунцы—39 руб. (для чыгуначнікаў і тых, хто мае дармовы праезд чыгунцы).

У зьвязку з некатарай наяўнасьцю вольных месц, прыём за жадаючых удзельнічаць у экскурсіі працягнут да 12-га мая. Гро ўносяцца ўсе разам.

Заявы і грошы перасылайце па адрасу: г. Менск, Комсамольская, 2 экскурсійнай камісіі газэты „Чырвоная Зьмена".

Увага: Экскурсанты з усіх акруг павінны прыехаць у Гомель свой кошт. Экскурсантам з далёкіх акруг будуць дадзены ільготы 50 проц. праезду да г. Гомелю.

Экскурсійная камісія газ. «Чырвоная Зьмена».

Пастанова

Народнага Камісарыяту Працы БССР ад 27-га красавіка г. г.

аб водпусках рабочай моладзі, якая едзе на Украі

Наркампрацы па згодзе з ЦСПСБ і ВСНГБ пастанаўл рабочай моладзі, якая едзе на экскурсію, організуемую рэд цыяй газэты „Чырвоная Зьмена" на Украіну, прадстаўляць ча говы водпуск за 1930 год, пачынаючы з 15-га мая 1930 г.

Нам. Наркамісара Працы **ЗАХАРАВА.**

Старшы праўны інспэктар **ГОЛЬДЗІНБЭРГ.**

С ь п і с

т. т. уключаных у склад экскурсіі—дэлегацыі н Украіну, падаўшых індывідуальныя заявы

1. Стаін Хаім,	Менск.
2. Каська С.,	„
3. Гравец Х.,	„
4. Фрадкін Л.,	„
5. Касьцюковіч Р.,	„
6. Чарняўская М.,	„
7. Тупік Л.,	„
8. Вігдорчык М.,	„
9. Дайнэка К.,	„
10. Дрэйцер М.,	„
11. Лейкіна Х.,	„
12. Карон М.,	„
13. Капілевіч Х.,	„
14. Сьляпян Л.,	„
15. Бацьвінік М.,	„
16. Жардзецкі М.,	Менакруга
17. Гарэлік Ц.,	Менск
18. Маліноўская Л.,	„
19. Нусінсон І.,	„
20. Опман З.,	Менакруга
21. Сінякевіч В.,	„
22. Нахай К.,	„
23. Грачанікаў Л.,	„
24. Позьняк А.,	„
25. Ліўшыц Б.,	Менск
26. Кэцько Л.,	Менакруга
27. Рутэнбэрг	Менск
28. Міцкеўскі Б.,	Менакруга
29. Коган Б.,	„
30. Міркін Л.,	„
31. Грышчанка П.,	Гомель
32. Колін Р.,	„
33. Юркавец Х.,	„
34. Юркавец Х.,	Бабруйск. акруг
35. Дайняк Я.,	„
36. Смоляк А.,	„
37. Гэльфанд Г.,	„
38. Панкевіч П.,	„
39. Камінскі Д.,	Мозырская акр
40. Віленскі А.,	„
41. Парэцкі М.,	Магілеў
42. Прыгожын К.,	„
43. Каткевіч П.,	Полацак
44. Зэгер П.,	Віцебская акруг
45. Давінскі М.,	Гомель

УВАГА: Аб астатніх тавар залічаных у склад экскурсіі, ў газэце надрукавана дадатко Апошні ўзнос прапануецца ў ці не пазьней 10-га мая.

Экскурсійная Камі газ. „Чырвоная Зьме

Грамадзкае харчаваньне па-гомельску

Брыгады па агляду грамадзкага харчаваньня ў Гомелі прыступілі ўжо да працы і на практыцы паказалі сваю непадрыхтаванасьць да гэтай справы, незнаёмства з мэтамі і задачамі агляду, а таксама і няведаньне сваіх функцый.

У некаторых выпадках аглядавыя брыгады выступалі ў ролі адміністратараў, яны хацелі зьняць з працы некаторых работнікаў сталовак. У сталоўцы № 1 брыгада забараніла жарыць прыгодную для ежы рыбу, і рабочым прышлося чакаць сьнеданьня каля дзьвёх гадзін. Асобныя брыгадзіры самі ідуць на кухню, чапаюць рукамі прадукты, грубяць з працаўнікамі сталовак. Брыгады ў цэлым вядуць агляд толькі пытаньнямі, здавальняючыся адказамі на іх. Яны не стараюцца ўнікнуць у справу забясьпечаньня сталовак прадуктамі і якасьцю іх, санітарным становішчам сталовак і абсталяваньнем. Брыгады зусім не займаюцца пытаньнем пастаноўкі выхаваўчай і культмасавай масы сярод колектываў сталовак, пытаньнем падрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы, зусім не зьвяртаецца ўвагі на дэфэкты ў рабоце і жыцьці асобных сталовак і іншыя ненармальныя зьявішчы. Характэрна адзначыць адносіны праўленьня транспартна-спажывецкага таварыства да агляду грамадзкага харчаваньня. Маючы цэлы шэраг сталовак і буфэтаў, праўленьне палец аб палец ня стукнула для популярызацыі задач агляду, ня ставіла нават гэтага пытаньня на абгаварэньне агульнага сходу супрацоўнікаў, не распрацавала яшчэ да гэтага часу конкрэтнага пляну ўдзелу ў аглядзе. Оргадздзел ТСТ бездапаможна чапляецца за „об'ектыўныя ўмовы". Праўленьне ТСТ займаецца больш комерцыяй, дзяляцтвам, толькі не пытаньнем грамадзкага харчаваньня. Праца ў сталоўках і буфэтах ТСТ да гэтага часу яшчэ не рацыяналізавана; рабочы дзень яшчэ ня ўшчыльнены. Клюбы не павярнуліся яшчэ тварам да агляду, яны ніяк ня могуць прыстасавацца да новых умоў і патрабаваньняў агляду, яны не хочуць ведаць аб тым, што грамадзкае харчаваньне набывае зараз выключнае значэньне. У аглядзе грамадзкага харчаваньне, здавалася-б, павінны былі прыняць асаблівы ўдзел групы „лёгкай кавалерыі", але яны да гэтага часу бязьдзейнічаюць. Раённы штаб „лёгкай кавалерыі" таксама бяздзейнічае. Конкрэтных плянаў працы ў сталоўках няма, як і працоўнай дысцыпліны. Рабочыя выкарыстоўваюцца нерацыянальна.

Некаторыя організацыі замест актыўнай дапамогі у наладжваньні справы грамадзкага харчаваньня, актыўна „смажуць" абежнікі рэзолюцыі

Цесната і перагружанасьць адгукваецца

У часе абедаў у сталоўках цесната немагчымая. За кожным абедаючым стаіць па некалькі кандыдатаў на яго месца. Памяшканьні для кухні ў большасьці сталовак непадыходзячыя. Столі нізкія і з-за пару і чаду нічога ня відаць, вэнтыляцыі няма. У пасудамойках цесната, ад чаго павялічваецца колькасьць бітае пасуды. Перагружанасьць сталовак, непрыстасаванасьць памяшканьняў, адсутнасьць кваліфікаванай рабочай сілы, а адгэтуль няўмелае абслугоўваньне наведвальнікаў — вось „об'ектыўныя" прычыны дрэннага становішча грамадзкага харчаваньня.

Калёрыйнасьць абедаў невыстарчальная. У абедзе бывае ў сярэднім толькі 600 калёрый, замест належачых па норме 800-850, тлушчы ў абедзьдзе ўсяго 10-15 гр., замест належных 30-35 грамаў. Меню месяцамі бывае аднолькавым.

Пры разьмеркаваньні дэфіцытных прадуктаў між сталоўкамі узьнікаюць вялікія недарэчнасьці. Сталоўкі, якія адпушчаюць па 100-150 абедаў у дзень (№ 5 і 6), атрымоўваюць 60 кілё сьлівачнага масла, а цэнтральныя сталоўкі № 1 і 2, якія прапушчаюць штодзённа па 2000-3000 абедаў у дзень, атрымоўваюць толькі па 20 кілё масла. Па асобных сталоўках на тыя-ж самыя прадукты існуюць рознастайныя цэны.

„На ненармальнасьці не рэагуюць"

У сталоўцы № 2 няма працдысцыпліны. Пануюць склокі і спрэчкі. Загадчык сталоўкі Патоцкі з прапановамі рабочых ня лічыцца, з рабочымі абыходзіцца вельмі дрэнна. П'янства, шкодніцтва і рвацтва зьвілі моцнае гняздо ў сталоўках № 1 і 2, і ў кухні разьмеркавальнікаў ЦРК.

Старэйшы повар сталоўкі № 2—Аўхімаў — амаль заўсёды зьяўляецца на працу п'яным. Аднойчы, зьявіўшыся на працу п'яным, ён выкінуў у пліту цэлы ліст булачак. У сталоўцы № 1 баечыствы прымаюць пагражаючыя памеры. Повар Алейнікаў і рабочы кухні Мяшчанка сыстэматычна псуюць прадукты, наладжваюць папойкі, пасьля якіх не зьяўляюцца на работу. Сярод працаўнікоў сталоўкі наглядаюцца рвацкія настроі. Штодзённа можна чуць пагрозы афіцыянтаў, што кінуць работу, калі не прыбавяць разраду. Таксама па-рвацку дзейнічае частка комсамольцаў і партыйцаў. Больш выдатныя з іх, гэта: Махавікоў, Ганчароў і Ліўшыц. Повар кухні разьмеркавальнік Чыбіст і рабочы Чайко штодзённа зьяўляюцца на працу п'янымі і прыносяць гарэлку нават на работу. Ненармальнасьці ў сталоўках не ліквідуюцца. Праўленьне ЦРК, партыйныя і профэсыйныя організацыі нічога ня робяць у галіне зьнішчэньня гэтых недахопаў. Усе зазначаныя недахопы, ненармальнасьці, шкодніцтва, рвацтва, незацікаўленасьць і расхлябанасьць у рабоце апарату сталовак і іншыя праявы можна выжыць толькі пры актыўным удзеле ў аглядзе грамадзкага харчаваньня ня толькі вылучаных брыгад, але і ўсёй грамадзкасьці.

В. СІДАРУК.

ДОПІС НЕ ПАДЦЬВЕРДЗІЎ

У нумарох 276 і 277 нашай га былі зьмешчаны два артыкулы назвай: „Організаваны сабата „Рвачы", у якіх пісалася, што цам комсамолец Альперовіч, ра менскай абутковай фабрыкі, орга ваў групу рабочых з 4-х чал якія паставілі перад сабой задачу батаваць работай, не выраблян нормы, якая патрэбна. Факты, а чаныя ў артыкулах, судовым сь твам, не падцьвердзіліся.

Адказны рэдактар— Рэдколе

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599